**20** гадоў
ТАВАРЫСТВУ
БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ
ІМЯ ФРАНЦІШКА
СКАРЫНЫ
1989–2009

Ірына МАРАЧКІНА,
Алег ТРУСАЎ

# Дзейнасць Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" паўстала ў той час, калі над мовай тытульнай нацыі навісла пагроза знішчэння. Заснавальнікамі новай арганізацыі сталі: Саюз пісьменнікаў Беларусі, Міністэрства народнай адукацыі, Міністэрства культуры, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа, Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР, Беларускі фонд культуры, Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом "Радзіма", Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, Дзяржаўны камітэт Беларускай ССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні.

27 чэрвеня 1989 года адбыўся Устаноўчы з'езд. У выбраную Раду ТБМ увайшлі 58 чалавек. Сярод іх такія відныя постаці нацыянальнай літаратуры, навукі і адукацыі, як Янка Брыль, Радзім Гарэцкі, Адам Мальдзіс, Барыс Сачанка, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Белакоз, Анатоль Бутэвіч, Яўген Вайтовіч, міністр народнай адукацыі Мікалай Дзямчук, сакратар Мінскага ГК КПБ Пётр Краўчанка. Старшынёй Рады быў абраны паэт Ніл Гілевіч, які быў старшынёй ТБМ па 1997 год. На Устаноўчым з'ездзе былі прыняты Статут ТБМ. Дзякуючы П.Краўчанку Рада атрымала памяшканне ў цэнтры Мінска на вул. Румянцава, 13, дзе знаходзіцца па сёння. 28 верасня 1989 г. ТБМ як грамадская арганізацыя была зацверджана Прэзідыумам Вярхоўнага Савета і набыла статус юрыдычнай асобы. Выканкамам абласных, Мінскага гарадскога Савета Вярхоўны Савет рэкамендаваў аказваць спрыянне Таварыству ў арганізацыі і працы яго рэгіянальных аддзяленняў. І сапраўды, аб'яднанне атрымала дзяржаўную падтрымку. Пастановай Вярхоўнага Савета БССР ад 28 верасня 1989 г. Дзяржплан устанавіў фонд заработнай платы на 1990 год у памеры 17 тыс. рублёў.

ТБМ распачало значную працу па адраджэнню беларускай мовы ў дзяржаўным, грамадскім і духоўным жыцці народа, прыняло ўдзел у падрыхтоўцы ў 1990 г. Закона "Аб мовах у Беларускай ССР", арганізацыі кантролю за выкананнем гэтага Закона; у стварэнні Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы ды іншых нацыянальных моў у Рэспубліцы Беларусь 1991 г. Пры ўдзеле сяброў Таварыства былі распрацаваны і прыняты Закон аб культуры, Закон аб адукацыі, Закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. 13 сяброў ТБМ былі абраны дэпутатамі Вярхоўнага Савета XII склікання, каля 100 — дэпутатамі мясцовых Саветаў.

У сакавіку 1990 г. пачаў выходзіць штомесячны бюлетэнь ТБМ "Наша слова". Грошы на яго выданне ў той час даў Савет Міністраў. Рэдактарам бюлетэня быў Ніл Гілевіч, сакратаром рэдакцыі і адказным за выпуск Генадзь Тумаш. У 1990 г. выйшла 10 нумароў, а ў студзені 1991 г. бюлетэнь быў пераўтвораны ў штотыднёвік, які выходзіў на 4-х палосах, а з 1992 г. — на 8-мі палосах. Галоўным рэдактарам штотыднёвіка "Наша слова" стаў паэт Эрнест Ялугін. Газета фінансавалася дзяржавай, мела штат літаратурных супрацоўнікаў.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі заснавальнікамі ТБМ сталі толькі яго члены. З 1989 па 1997 год, калі ў Беларусі распачалася актыўная праца па адбудове сваёй незалежнай дзяржавы, старшынёй ТБМ быў народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. Галоўным сэнсам дзейнасці Таварыства было стаўленне да роднай мовы як да нацыянальнай святыні, адраджэнне гістарычнай памяці, традыцыйнай культуры нашага народа і пабудова на нацыянальным грунце дэмакратычнага грамадства. Мы лічылі і лічым, што беларуская мова і беларуская дзяржаўнасць — паняцці тоесныя. Адкрываліся беларускія класы і школы, адукацыя на роднай мове набывала статус элітарнай. Кожная школа з беларускай мовай навучання імкнулася стаць ліцэем або гімназіяй. Па-беларуску сталі выкладацца асобныя прадметы ў ВНУ, найперш гісторыя Беларусі. Беларуская мова станавілася прэстыжнай, а яе носьбіт прыкметай дабра і адукаванасці.

Пры ТБМ дзейнічала 9 камісій: арганізацыйна-прапагандысцкая, адукацыйная, тэрміналагічная, па культуры мовы і ўдасканаленню правапісу, па тапані-

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

міцы і гістарычнай сімволіцы, па моўных скарбах, па зрокавым і гукавым афармленнях жыццёвага асяроддзя, па сувязях з замежнымі краінамі, выдавецкая. Таварыства актыўна займалася выдавецкай дзейнасцю. За 1990—1995 гг. было выдадзена больш за 20 кніг мастацкай, навуковай, навукова-папулярнай і асветніцкай літаратуры, у тым ліку "Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва" М.Шчакаціхіна, "Пачаткі роднае мовы" В.Раманцэвіч, "Геаграфія Беларусі" А.Смоліча, тэрміналагічныя слоўнікі па фізіцы, вышэйшай матэматыцы, заапаразіталогіі, батаніцы і інш.

На жаль, з 1995 года над роднай мовай навісла новая пагроза. Па выніках рэферэндумаў 1995, 1996 гадоў рускай мове быў нададзены статус другой дзяржаўнай. Пачалася новая хваля вынішчэння беларускасці, выцяснення роднай мовы з грамадскага і дзяржаўнага ўжытку. Толькі за адзін 1995 год былі ліквідаваны 152 школы з беларускай мовай навучання. У 1997 г. дзяржава спыніла фінансаванне газеты "Наша слова", і на працягу шасці месяцаў — з красавіка па кастрычнік 1997 года — яна не выходзіла.

Выданне "Нашага слова" было адноўлена ў лістападзе, дзякуючы добраму грамадзянскаму ўчынку Станіслава Судніка, галоўнага рэдактара, які на грамадскіх пачатках на грошы ахвяравальнікаў адрадзіў гэтую газету ў г. Ліда. З таго часу штотыднёвік "Наша слова" там і выдаецца. Зараз яго наклад 2000 экземпляраў.

У самы неспрыяльны для нашай арганізацыі перыяд з 1997 па 1999 гады Таварыства ўзначальваў паэт Генадзь Бураўкін. Пад яго кіраўніцтвам ТБМ разгортвае працу па зборы подпісаў пад патрабаваннем адкрыць Беларускі нацыянальны універсітэт. 1 студзеня 1998 года ТБМ спыняе гаспадарчую дзейнасць, прадае свой кіёск. Пракуратура Партызанскага раёна Мінска ў маі месяцы накіроўвае ў гаспадарчы суд Мінскай вобласці іскавую заяву ў інтарэсах ЖРЭА Партызанскага раёна аб высяленні ТБМ з памяшкання па вул. Румянцава, 13 з прычыны запазычанасці па арэндзе ў суме 840 мільёнаў рублёў. 25—26 чэрвеня Таварыства беларускай мовы высяляюць з сядзібы. Дзякуючы вялікаму вопыту арганізацыйнай работы ў якасці старшыні Дзяржкамітэта БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні (1972—1990) і аўтарытэту Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Беларусі пры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (1990—1994) Генадзь Бураўкін належным чынам справіўся з роляй "крызіснага менеджэра". Пры міжнароднай дапамозе ён знайшоў сродкі і аплаціў даўгі па арэндзе, а неўзабаве здолеў вярнуць былое памяшканне. ТБМ не толькі выстаяла, але і значна актывізавала сваю дзейнасць.

З 1999 года Таварыства ўзначальвае кандыдат гістарычных навук, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XII склікання (1990—1996 гг.), намеснік старшыні камісіі Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны Алег Трусаў.

Пры грамадскім аб'яднанні ў гэтым жа годзе ствараецца бібліятэка, фонд якой на сённяшні дзень складае каля 1 500 адзінак. Сярод іх перыядычныя выданні, кнігі, у тым ліку рэдкія кнігі, выдадзеныя ў пачатку XX ст. у Вільні, Пецярбургу, эміграцыйныя выданні сярэдзіны XX ст. Бібліятэка збірае выданні пра Беларусь на розных мовах, вядзе электронны каталог.

У той жа час была створана ініцыятыўная група па арганізацыі Беларускага нацыянальнага універсітэта, у склад якой увайшлі 68 аўтарытэтных дзеячаў беларускай навукі і культуры. Распрацоўвалася канцэпцыя будучага БНУ, быў арганізаваны збор подпісаў, колькасць якіх на канец 2001 г. складала каля 55 000. На жаль, ідэя стварэння такой ВНУ не знаходзіць дзяржаўнай падтрымкі і пакуль застаецца нерэалізаванай. Аднак ТБМ не адмаўляецца ад сваёй задумы і шукае шляхі стварэння БНУ на аснове тэхналогій дыстанцыйнага навучання.

Паступова ТБМ ператваралася ў адну з вядомых праваабарончых арганізацый краіны, якая прымае актыўны ўдзел у нацыянальных і міжнародных праваабарончых форумах, выступае ў падтрымку Саюза беларускіх пісьменнікаў, Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя, Скарынаўскага цэнтра, часопіса "Бярозка", бароніць лінгвістычныя правы грамадзян краіны.

У 2000 г. ТБМ выпусціла зборнік дакументальных матэрыялаў, артыкулаў, даследаванняў "Аняменне: з хронікі знішчэння беларускай мовы", дзе раскрываецца палітыка русіфікацыі ў Беларусі. Таварыства патрабуе ад уладаў унясення змен і дапаўненняў у дыскрымінацыйны для беларускамоўных грамадзян Беларусі "Закон аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" і заклікае прыняць неадкладныя меры па захаванню аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Дарэчы, па просьбе сяброў і прыхільнікаў ТБМ Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у снежні 2003 г. разгледзеў гэта пытанне і прыняў рашэнне аб неадпаведнасці Канстытуцыі Беларусі вышэй згаданага Закона. Намаганнямі ТБМ беларуская мова вярнулася на чыгунку, у сферу банкаўскай і фінансавай дзейнасці, з'явілася ў абвестках метрапалітэну. Яе пачалі ўсё шырэй выкарыстоўваць айчынныя і замежныя вытворцы ў афармленні харчовых і прамысловых тавараў.

Таварыства беларускай мовы карыстаецца аўтарытэтам у галіне мовазнаўства. Дзяржаўныя структуры раяцца з намі пры распрацоўцы стандартаў па-беларуску. Вялікім попытам карыстаецца унікальная, першая ў Беларусі праграма праверкі арфаграфіі "Літара 1.0".

У распрацаванай сябрамі Таварыства Стратэгіі развіцця беларускай мовы ў XXI ст., канчатковы варыянт якой быў абмеркаваны на пасяджэнні Рады ТБМ 26 студзеня 2003 г., прадугледжваецца комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на доўгатэрміновую перспектыву:

— стварэнне беларускамоўнага спадарожнікавага тэлеканала;

— арганізацыя дзейнасці сеткавага Інтэрнет (INTERNET) партала для атрымання вышэйшай адукацыі беларускамоўнымі грамадзянамі ва універсітэтах Еўропы;

— адкрыццё Беларускага нацыянальнага універсітэта;

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

— арганізацыя спеўных (KARAOKE) клубаў для аматараў беларускай песні ды іншае.

На працягу апошніх 14 гадоў у Беларусі адбываецца няўхільнае скарачэнне колькасці беларускамоўных школ, класаў, дзіцячых садкоў. Негатыўныя тэндэнцыі ў беларускамоўнай адукацыі яшчэ ў 2001 г. былі прызнаныя Міністэрствам адукацыі, якое для паляпшэння сітуацыі 27 жніўня выдала Пастанову № 48 разам з "Праграмай дадатковых мер па пашырэнню сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі". Аднак гэтая пастанова і праграма засталіся, за некаторым выключэннем, толькі на паперы, як і аналагічныя праграмы абласных выканаўчых камітэтаў. З году ў год змяншаецца колькасць вучняў, якія навучаюцца па-беларуску, дашкольнікаў, якія чуюць беларускую мову ў садках, студэнтаў, якія слухаюць беларускамоўныя лекцыі ў ВНУ. Змяншаецца колькасць вучняў, якія ідуць у беларускамоўныя першыя класы. Па звестках Міністэрства адукацыі, на пачатак 2008—2009 навучальнага года ў агульнаадукацыйных установах з беларускай мовай навучання ўсіх тыпаў вучылася 18,4% вучняў. У 2009—2010 навучальным годзе ў гарадскіх школах краіны ў першых класах на беларускай мове будуць вучыцца толькі 1,9% вучняў. Фактычна мы перажываем жорсткі крызіс моўнай і нацыянальна-культурнай самабытнасці нашага народа.

Беларускае грамадства рэальна страчвае навыкі беларускага маўлення. Губляецца нацыянальная тоеснасць і адметнасць. Па сутнасці, ствараецца касмапалітычны соцыум, што ў эпоху глабалізацыі нясе рэальную пагрозу існаванню беларускага этнасу і беларускай дзяржавы.

У сувязі з гэтым Рада ТБМ на сваім пасяджэнні 18 студзеня 2009 г. выказала занепакоенасць тымі наступствамі, якія нясе Беларусі страта моўнай самабытнасці. Кіраўніцтву краіны быў заяўлены рашучы пратэст супраць бяздзеяння ўладаў у галіне беларускамоўнай адукацыі і выказана патрабаванне неадкладна вярнуцца да поўнага выканання "Праграмы дадатковых мер па пашырэнню сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі" 2001 года.

ТБМ канстатуе гатоўнасць усіх рэгіянальных структур нашага аб'яднання аказаць на месцах самую дзейсную дапамогу ўстановам адукацыі ў выкананні вышэйназванай Праграмы і звяртаецца да ўсіх грамадзян Беларусі, асабліва да бацькоў будучых першакласнікаў, каб яны ўжо цяпер падавалі заявы аб жаданні навучаць сваіх дзяцей на беларускай мове. ТБМ прапануе беларускім студэнтам неадкладна патрабаваць беларускамоўнага навучання і аб'ядноўвацца ўжо зараз у адпаведныя групы і плыні ў сваіх ВНУ.

Галоўным напрамкам дзейнасці ТБМ застаецца змаганне за пашырэнне беларускамоўнай інфармацыйнай прасторы ў СМІ, навучальных установах, транспарце, візуальным афармленні нашых гарадоў і вёсак. Па прапанове ТБМ у ВНУ захаваны абавязковы курс "Беларуская мова. Прафесійная лексіка", а гісторыю і геаграфію ў рускамоўных школах са згоды бацькоў, вучняў і настаўнікаў можна выкладаць па-беларуску.

Напрыканцы жніўня 2006 г. улады абвясцілі пра будучыя змены ў беларускім правапісе, але абмеркаванне ў грамадстве па гэтым пытанні не вызначалася. Такое абмеркаванне адбылося ў сядзібе ТБМ у Мінску. Прапанаваныя дадаткі і заўвагі былі накіраваны ў Адукацыйную камісію Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Некаторыя з іх былі ўлічаны, і дзякуючы гэтаму апошні варыянт закона, які ўнёс змены ў сучасны правапіс, прыняты ў мінулым годзе, стаў больш прыдатны для карыстання.

Каб крочыць у нагу з часам, мы стварылі новы сайт ТБМ, захаваўшы пры гэтым ранейшы, на якім змешчаны Статут ТБМ у новай рэдакцыі. З ім можа пазнаёміцца кожны жадаючы. Таксама з'явіўся сайт Лідскай гарадской арганізацыі ТБМ, на якім можна азнаёміцца з апошнімі нумарамі газеты "Наша слова".

У многім дзякуючы намаганням ТБМ 10 снежня 2007 г. пачаў сваё вяшчанне тэлевізійны спадарожнікавы беларускамоўны канал "Белсат", які можна глядзець кожны дзень па спадарожніках "Астра" і "Сірыус". Напрыканцы мінулага года была створана кансультацыйная рада тэлеканала "Белсат", якую ўзначаліў былы кіраўнік Беларускай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, сябра Рады ТБМ паэт Генадзь Бураўкін. Зараз праграму перадач тэлеканала "Белсат" сталі друкаваць у газетах "Народная воля" і "Наша Ніва".

У 2007 г. намаганнямі Аляксея Караля і намесніка старшыні гарадской арганізацыі ТБМ Алены Анісім рэгулярна пачала выходзіць другая газета ТБМ "Новы час", заснаваная Мінскай гарадской арганізацыяй ТБМ у 2002 г. У ёй таксама па магчымасці друкуецца дадатак "Беларусь літаратурная", які рыхтуе да друку Саюз беларускіх пісьменнікаў.

Сябры ТБМ дамагліся таго, што зараз гучаць у эфіры дзве цалкам беларускамоўныя радыёстанцыі "Еўрапейскае радыё для Беларусі" і "Радыё Рацыя"; загаварылі па-беларуску "Нямецкая хваля" і "Радыё Швецыі", пашырылася сфера выкарыстання беларускай мовы на транспарце; беларуская мова загучала ў метро, трамваях, аўтобусах, тралейбусах і электрацягніках. Уся філатэлістычная прадукцыя суправаджаецца тэкстамі на беларускай мове.

Мы стараемся, наколькі гэта магчыма, заўважаць і падтрымліваць рупліўцаў беларускай мовы, дасылаем лісты з падзякамі тым прадпрыемствам, якія пачалі выкарыстоўваць роднае слова. Гэта розныя замежныя фірмы і беларускія прадпрыемствы. Мы ўдзячныя Міністэрству сувязі і інфарматызацыі, якое прыслухоўваецца і, па магчымасці, улічвае нашы прапановы па выпуску паштовай прадукцыі на беларускай мове. Шмат гадоў спрыяе нам Федэрацыя беларускіх прафсаюзаў, дзякуючы фінансавай падтрымцы якой мы маем магчымасць падпісаць шэраг раённых школьных бібліятэк, а таксама музеяў на "Наша слова", выпісаць іншыя беларускія выданні.

Жыццядзейнасць ТБМ, станоўчыя вынікі яго працы звязаны з пастаяннымі стасункамі ўнутры структуры — ад абласных арганізацый да кожнай суполкі і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ




Каляндарык, прысвечаны 20-годдзю Таварыства беларускай мовы.




Буклет Таварыства беларускай мовы.




Каляндарык, прысвечаны 220-годдзю з дня нараджэння Івана Насовіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нават асобных сяброў; з іншымі грамадскімі арганізацыямі (Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", Саюз беларускіх пісьменнікаў, грамадская арганізацыя "Ветэраны адраджэння", суполка мастакоў "Пагоня", грамадскі рух БНФ "Адраджэньне"); а таксама з уладнымі структурамі рознага ўзроўню.

У мінулым годзе прадаўжаліся літаратурныя сустрэчы пісьменнікаў з жыхарамі горада Мінска. Яны адбываліся на сядзібе ТБМ, у школах, навучальных установах, бібліятэках. Тыя, што праходзяць на сядзібе ТБМ, загадзя анансуюцца ў СМІ: газетах "Наша слова", "Народная воля", "Наша ніва", "Новы час". Слухачы атрымліваюць бязвыплатна шмат асобнікаў розных цікавых кніг і брашур, нумароў газет "Наша слова" і "Народная воля".

Паспяхова праходзілі заняткі семінара "Я магу жыць лепей" (Людміла Дзіцэвіч), курсы беларускай мовы (Алена Анісім). У сядзібе ТБМ рэгулярна ладзяцца мастацкія выставы і прэзентацыі розных беларускіх выданняў.

На курсах беларускай мовы прысутныя спасцігаюць навуку быць беларусамі: знаёмяцца з каляндарна-абрадавымі святамі, даведваюцца пра цікавыя, але слаба вядомыя мясціны ў Беларусі, практыкуюцца ў карыстанні беларускай мовы ў розных сітуацыях і іншае.

З гэтага практычнага вопыту выразна праступае наступная задача ТБМ — неабходнасць стварэння беларускамоўных асяродкаў, магчыма ў выглядзе розных клубаў ці нечага падобнага. А калі глядзець далей і шырэй — арганізацыя маладзёжнага руху ўнутры ТБМ. Вядома, без залішняй фармалізацыі, але з рэальнымі цікавымі для моладзі справамі. Гэта, у сваю чаргу, дапаможа вырашыць справу з кадрамі (стварэнне беларускамоўных дзіцячых садоў і класаў, экскурсіі і вандроўкі па Беларусі і г. д.).

Акрамя таго, на гэтых курсах вырашана распачаць працу над стварэннем размоўнікаў "Як гэта сказаць па-беларуску". Удзельнікі курсаў рыхтуюць беларускую частку. А для ажыццяўлення перакладных частак — нямецкай, італьянскай, шведскай, англійскай — будзем шукаць партнёраў.

ТБМ з 1 кастрычніка 2008 г. бярэ актыўны ўдзел у грамадскай культурніцкай кампаніі "Будзьма". У аснове акцыі — пашырэнне ўяўлення маладых пра сябе як прадстаўнікоў беларускай нацыі, адчуванне сябе беларусамі. Лічым, што менавіта сёлета, у год чарговага перапісу насельніцтва, вельмі важна несці ў народ роднае слова.

Таварыства арганізавала сустрэчы ў розных гарадах Беларусі: Мінску, Баранавічах, Лідзе, Наваполацку, Магілёве, Валожыне, а таксама ў Дзятлаўскім, Лідскім, Нясвіжскім, Мінскім і іншых раёнах.

Да 200-х угодкаў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, якія адбыліся 4 лютага 2008 года, мы падрыхтавалі і выдалі кішэнны каляндар на 2008 год. Па нашай прапанове ўлады выдалі паштовую марку і адмысловы канверт з выявай класіка беларускай літаратуры. У Бабруйску яму быў пастаўлены помнік.

Да пачатку 2008—2009 навучальнага года, у сувязі з 220-мі ўгодкамі Івана Насовіча, пабачыў свет кішэнны каляндар ТБМ, прысвечаны аўтару першага слоўніка беларускай мовы.

Быў адноўлены выпуск адрыўнога беларускамоўнага календара "Родны край" на 2009 год. Ён паступіў у продаж у верасні месяцы і хутка разышоўся.

На вялікі жаль, напрамкі дзейнасці Таварыства, як і 15 гадоў таму, не змяніліся. Тыя ж задачы, тая ж самая мэта: абарона беларускай мовы, нашай дзяржаўнасці ды асветніцтва праз гістарычныя семінары, пазнавальныя конкурсы, курсы беларускай мовы, месячнікі, вечарыны. Хочацца верыць, што некалі ж ды будзе ТБМ займацца выключна пытаннямі культуры мовы, як гэта мае месца ў іншых краінах — Францыі, Украіне.

Таварыства мае сваю сімволіку, распрацаваную мастаком Міколай Купавам. Яна складаецца з герба Францішка Скарыны, бела-чырвона-белай стужкі і старадаўняга агульнабеларускага герба "Пагоня". Сімволіка ўключана ў Дзяржаўны геральдычны рэестр Рэспублікі Беларусь за № Б-93.

ТБМ выступае за канструктыўны дыялог з уладамі па пытанню надання беларускай мове рэальнага статусу дзяржаўнай. Гэты дыялог за апошнія месяцы актывізаваўся.

Таварыства беларускай мовы — адно з самых уплывовых грамадскіх аб'яднанняў, з якім лічацца, да якога прыслухоўваюцца ўлады, якое паважаюць і ўскладаюць на яго вялікія надзеі грамадзяне краіны. На сённяшні дзень яно налічвае ў сваіх шэрагах каля 7 тысяч сяброў, аб'яднаных у абласныя, гарадскія і раённыя структуры. Актыўнымі членамі ТБМ з'яўляюцца таксама беларусы Расіі (Масквы, Санкт-Пецярбурга, Іркуцка), Украіны (Севастопаля, Кіева), Літвы (Вільні), Латвіі (Рыгі), Польшчы (Беластока), Чэхіі (Прагі), Канады, Германіі, Аўстраліі, Францыі, ЗША.

Таварыства мае сваю старонку ў віртуальнай прасторы Інтэрнета: http://tbm.org.by/.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ